ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

# ЧЫРВОНАЯ ЗВЯЗДА

ОРГАН КОСАЎСКАГА РК КП(б) БЕЛАРУСІ І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ

№20 (40) Чацвер 24 мая 1945 г.

ВЯЛІКІЯ АФЯРЫ, ПРЫНЕСЕНЫЯ НАМІ Ў ІМЯ СВАБОДЫ І НЕЗАЛЕЖНАСЦІ НАШАЙ РАДЗІМЫ, НЕЗЛІЧОНЫЯ НЯСТАЧЫ І ПАКУТЫ, ПЕРАЖЫТЫЯ НАШЫМ НАРОДАМ У ХОДЗЕ ВАЙНЫ, НАПРУЖАНАЯ ПРАЦА Ў ТЫЛУ І НА ФРОНЦЕ, АДДАНЫЯ НА АЛТАР АЙЧЫНЫ,—НЕ ПРАЙШЛІ ДАРЭМНА І ЎВЯНЧАЛІСЯ ПОЎНАЙ ПЕРАМОГАЙ НАД ВОРАГАМ.

І. СТАЛІН

## АТРЫМАЦЬ УРАДЖАЙ ДАСТОЙНЫ НАШАЙ ПЕРАМОГІ

Уся наша вялікая радзіма перажывае радасныя дні. Гітлераўская Германія разгромлена, вораг канчаткова разбіт. 15 мая доблесныя войскі Чырвонай Арміі закончылі прыём капітуліраваўшых нямецкіх войск. З 9 па 14 мая на ўсіх франтах узята ў палон больш 1 мільёна 230 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў і 101 генерал.

Неацанімы ўклад унеслі савецкія сяляне ў барацьбу за часць, свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы. Сяляне нашага раёна з першага дня свайго вызвалення аддавалі ўсе сілы на хутчэйшы разгром ворага. І зараз, калі перамога заваёвана, сваёй упартай працай на сяўбе яны стараюцца яшчэ больш праславіць сваю любімую радзіму.

У нашым раёне план сяўбы выкапан на 103 проц. Але сяўба яшчэ прадаўжаецца. Сяляне стараюцца пасеяць чым больш. Асабліва шырокі размах набывае сяўба бульбы і гароднiны.

На раду з заканчэннем сяўбы неабходна зараз распрацаваць мерапрыемствы па правільнаму і штодзённаму ўходу за пасевамі. Добры догляд за пасевамі, своечасовая прапалка пасеваў і асабліва тэхнічных культур—адно з важнейшых мерапрыемстваў, павышаючых ураджай. У гэтай справе вялікую дапамогу сялянам павінны аказаць спецыялісты сельскай гаспадаркі.

Барацьба за высокі ўраджай—барацьба за хутчэйшае аднаўленне гаспадаркі ў раёнах, якія падвергаліся нямецкай акупацыі, за паляпшанне матэрыяльна-бытавога становішча савецкага народа, за далейшае ўзмацненне ваенна эканамічнай магутнасці нашай Радзімы. Узорна закончым веснавую сяўбу, атрымаем ўраджай дастойны нашай вялікай перамогі!

## РАЁННЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД

20 мая адбыўся раённы партыйны сход, які абмеркаваў першамайскі загад т. Сталіна і зварот т. Сталіна да народу. З дакладам аб задачах партарганізацыі ў свеце выканання ўказанняў т. Сталіна ў першамайскім загадзе і звароце да народу, выступіў сакратар РК КП(б)Б т. Юшкевіч.

—Першамайскі загад т. Сталіна і зварот т. Сталіна да народу,—гаворыць дакладчык,—дакументы вялікай гістарычнай важнасці. Указанні нашага любімага правадыра, зробленыя ў гэтых дакументах з'яўляюцца праграмай дзейнасці кожнага комуніста. Зараз, калі вялікая Айчынная вайна закончылася поўным разгромам гітлераўскай Германіі, перад нашай партарганізацыяй паўстаюць задачы аднаўлення ўсяго разбуранага акупантамі. Мы павінны ў бліжэйшы час залячыць усе раны, нанесеныя нам вайной.

Раённы партыйны сход адзначыў, што ў раёне яшчэ да гэтага часу нездавальняюча ідзе будаўніцтва жылых дамоў і асабліва ў Жытлінскім, Яглевіцкім і Яблочскім сельсоветах, якія найбольш пацярпелі ад нямецкай акупацыі. З 2317 жылых дамоў, спаленых немцамі, новых пабудована толькі 538 дамоў.

Асаблівую ўвагу партыйны сход звярнуў на арганізацыю ў раёне вытворчасці будаўнічых матэрыялаў на базе мясцовай прамысловасці. Вытворчасць такіх неабходных матэрыялаў як цэгла, чарапіца, гонта і дор не наладжана, хаця для гэтага ёсць усе магчымасці. Партыйны сход абавязаў дырэктара райпромкамбіната комуніста т. Саменка прыняць рашучыя меры для наладжання вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Партыйны сход звярнуў сур'ёзную ўвагу на мабілізацыю фінансавых сродкаў, як магутную базу ў справе аднаўлення разбуранай народнай гаспадаркі, на ўзмацненне палітыка-выхаваўчай работы сярод насельніцтва, мабілізуючы яго на барацьбу за высокі ўраджай.

Сход прыняў пастанову, у якой абавязаў усіх комуністаў наладзіць вывучэнне загада і зварота тав. Сталіна да народу на ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах і вёсках раёна, ва ўсіх партыйных і комсамольскіх арганізацыях і на аснове сталінскіх указанняў мабілізаваць насельніцтва раёна на хутчэйшае аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі.

## Магутная дэманстрацыя савецкага патрыятызма

Падпіска на Чацвертую Дзяржаўную ваенную пазыку ў нашым раёне выклікала вялікі палітычны ўздым працоўных, яна ператварылася ў магутную дэманстрацыю савецкага патрыятызма працоўных нашага раёна.

Ужо ў першы дзень падпіскі у такіх сельсоветах як Стайкаўскі, Яглевіцкі арыентыровачная сума падпіскі было значна перакрыта. Арганізавана прайшла падпіска ў Белавіцкім, Любішчыцкім і другіх сельсоветах.

На 14 мая сума падпіскі па раёну дасягнула паўтара мільёна рублёў. Наяўнымі ўнесена 176 тысяч рублёў. Такім чынам арыентыровачная сума для нашага раёна ў 900000 руб. значна перакрыта. Зараз задача заключаецца ў тым, каб кожны падпісчык у самы бліжэйшы час унёс грошы па падпісцы.

# МІЖНАРОДНЫ АГЛЯД

Совецкі народ і ўсе народы свабодалюбівых краін перажываюць дні найвялікшага тарҗаства. Разгромлен і безагаворачна капітуліраваў каварны і моцны вораг, які пагражаў заняволіць совецкую краіну і іншыя дзяржавы Еўропы і ўсяго свету. Ні адзін захопнік у гісторыі войн не выступаў яшчэ з такім магутным узбраеннем, не быў яшчэ так блізак да паспяховага ажыццяўлення сваіх замыслаў, як гітлераўцы. І разам з тым гісторыя войн не ведае такога бязлітаснага і рашучага разгрому ўзброеных сіл, які панесла гітлераўская Германія. Разбіта ўся ваенная і дзяржаўная машына немцаў. Уся тэрыторыя праціўніка занята Чырвонай Арміяй і арміямі саюзнікаў. Краіна, уцягнуўшая чалавецтва ў жудасную вайну, атрымала найвялікшы і суровы ўрок.

Поўнасцю апраўдаліся геніяльныя прадбачанні вялікага Сталіна, указаўшага яшчэ ў 1941 г. на непазбежнасць разгрому гітлераўскай Германіі народамі Еўропы і Амерыкі, якія аб'ядналіся з Совецкім Саюзам у барацьбе за сваю свабоду і незалежнасць.

З вялікай радасцю ўспрынялі совецкія людзі гістарычную заяву т. Сталіна аб тым, што Вялікая Айчынная вайна завяршылася нашай поўнай перамогай, што перыяд вайны ў Еўропе скончыўся і пачаўся перыяд мірнага развіцця.

У зводках Соўінформбюро зараз штодзённа паведамляецца аб тым, што разбіты вораг складае зброю к нагам народа-пераможца. Толькі з 9 па 14 мая на совецка-германскім фронце перад Чырвонай Арміяй капітуліравала і здалося ў палон звыш 1 мільёна 230 тысяч салдат і афіцэраў нямецкай арміі і 101 генерал. Падлічваюцца велізарныя ваенныя трафеі.

Усе палітычныя дзеячы і сусветны друк прызнаюць велізарную, рашаючую ролю Совецкага Саюза ў разгроме ворага, адзначаючы, што іменна напад на совецкую краіну прывёў фашысцкую Германію да пагібелі.

Зараз перад свабодалюбівымі народамі стаіць задача завяршыць ваенны разгром фашысцкай Германіі поўным яе раззбраеннем, ліквідаваць фашызм ва ўсіх яго праявах і забяспечыць трывалы доўгачасовы мір.

У руках саюзнікаў аказалася цяпер значная колькасць буйных ваенных злачынцаў на чале з Герынгам, Шахтам, фон Папенам, генераламі Кесельрынгам, Рундштэдтам, Гудэрыянам, Клейстам. Дэмакратычны друк аднадушна патрабуе хуткага і суровага суда над гітлераўскімі злачынцамі.

Палітычныя дзеячы дэмакратычных краін прыдаюць велізарнае значэнне адзінству вялікіх дзяржаў. Адзінства, якое забяспечыла перамогу ў вайне супроць захопнікаў, неабходна і для паспяховага ажыццяўлення трывалага міру. Канферэнцыя ў Сан-Францыска, якая працуе над статутам Міжнароднай арганізацыі бяспекі, якраз і павінна стварыць прадпасылкі паспяховай барацьбы супроць любой новай агрэсіі.

Глава совецкай дэлегацыі на канферэнцыі т. Молатаў, выступаючы 7 мая перад прадстаўнікамі друку ў Сан-Францыска, выказаў упэўненасць у станоўчых выніках гэтай канферэнцыі.

В. Грышанін.

## СЯЎБУ ПРАВЯЛІ ПАСПЯХОВА

Перад пачаткам вясенне-палявых работ мы стаялі перад вялікімі цяжкасцямі. Нехапала цяглавай сілы. Але потым, калі мы прыгледзеліся да нашых магчымасцяў, усе ўзважылі і абмеркавалі, аказалася, што ў нашай вёсцы сяўбу можна правесці паспяхова.

Дзякуючы арганізаванай узаемадапамозе бясконным, сяляне нашай вёскі ўжо поўнасцю пасеялі зерневыя культуры, тэхнічныя, заканчваюць сяўбу бульбы. Сяляне Падражанец Ніна, Грышкевіч Осіп, Цэменя Васіль, Калінка Платон, Валах Сцяпан і многія другія дапамаглі ў сяўбе сваімі коньмі 4 м і больш бясконным гаспадаркам кожны.

Зараз асталося пасеяць грэчку і другія познія культуры і арганізаваць добры догляд за пасевамі каб атрымаць добры ўраджай.

ф. Скуратовец, упаўнаважаны сельсовета ў в. Бельвічы.

## За граніцай

### СНЕДАННЕ Ў ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА У. ЧЭРЧЫЛЯ Ў ГОНАР ПАСЛА СССР Ф. Т. ГУСЕВА

Лондан, 18 мая. (ТАСС). Прэм'ер-міністр У. Чэрчыль даў сёння снеданне ў гонар пасла СССР у Лондане Ф. Т. Гусева і яго супругі. На снеданні прысутнічаў англійскі пасол у Маскве А. Кларк Кэр.

### Заява штаба экспедыцыйных сіл саюзнікаў аб становішчы Дэніца

ЛОНДАН, 16 мая. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, вечарам 16 мая ў штабе вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў было аб'яўлена, што адмірал Дэніц і другія германскія афіцэры часова скарыстоўваюцца для выканання абавязкаў, звязаных з забеспячэннем прадавольствам, раззбраеннем і медыцынскім абслугоўваннем германскай арміі. Дзеянні гэтых германскіх афіцэраў поўнасцю кантраліруюцца саюзнікамі; гэтыя афіцэры павінны строга прытрымлівацца ўказанняў саюзных камандуючых.

### Паведамленне карэспандэнта амерыканскага радыё аб арышце Гімлера

ЛОНДАН, 12 мая (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне парыжскага карэспандэнта амерыканскай радыёвяшчальнай кампаніі Калумбія аб тым, што Гімлер знаходзіцца ў сучасны момант у руках англійскіх улад. Як відаць, адмірал Дэніц затрымаў яго ў раёне Фленсбурга і цяпер перадаў у рукі англійскіх войск.

### Узяты ў палон Функ, Ламерс і Онезорге

НЬЮ-ЙОРК, 12 мая, (ТАСС). Нью-Йоркскае радыё паведаміла, што амерыканскімі войскамі ўзяты ў палон відныя дзеячы гітлераўскай Германіі — імперскі міністр гаспадаркі Функ, імперскі міністр пошт Онезорге і начальнік імперскай канцылярыі Ламерс.

Адказны рэдактар А. П. Рудой

Г Л 15264 Адрэс рэдакцыі: гарадскі пасёлак Івацэвічы вул. Шасейная дом № 11